АПТЫМІЗАЦЫЯ

# СКАМАРОШКІ, ФАБРЫЧНЫ І БЕЛЫЯ РОСЫ

## Як развіваюцца тэрыторыі, якія «праглынуў» горад

**Роўна 10 гадоў таму плошча Гродна павялічылася больш чым у два разы. У склад горада ўвайшлі тры дзясяткі прыгарадных вёсак і садовых таварыстваў. Далучыліся да горада і ворныя землі... Наш карэспандэнт прайшлася па адным з былых пасёлкаў, каб убачыць змены, якія адбыліся за гэты час.**

У красавіку 2008 года выйшаў указ Прэзідэнта, згодна з якім былі зменены межы горада Гродна. Тэрыторыя абласнога цэнтра значна пашырылася. Калі да гэтага часу яго плошча складала каля шасці тысяч га, то пасля ўказа павялічылася да 14 тысяч. У склад горада ўвайшлі 25 вёсак трох сельсаветаў, а таксама больш за 10 дачных таварыстваў.

**Начальнік упраўлення землеўпарадкавання гарвыканкама Андрэй КУХЦЮК** удакладняе: у 2011 годзе выйшаў яшчэ адзін указ аб пашырэнні межаў горада. Але гэта быў не такі маштабны перадзел — да горада далучылі каля 200 га зямлі з вёскай Альшанкай, побач з якой цяпер вырас новы мікрараён з такой жа назвай.

На новых тэрыторыях паўсюдна ідзе забудова, кажа Андрэй Кухцюк. З дапамогай спутнікавай карты робім спробу ацаніць маштабы таго, што зроблена за 10 гадоў. Вяртаемся ў 2008-ы. Здымкі паказваюць, што некаторых мікрараёнаў не было ўвогуле, у іншых — участкі асвойваліся, можна сказаць, кропкава. Напрыклад, каля былой вёскі Зарыца налічваецца ўжо пяць мікрараёнаў. А ў той час тут толькі пачалі будавацца.

Андрэй Кухцюк раз-пораз паказвае гарадскія «кавалкі», дзе яшчэ нядаўна было пуста. Разам з жылымі дамамі выраслі вытворчыя прадпрыемствы, гандлёвыя і сацыяльныя аб'екты. Пракладзены не проста дарогі, а сапраўдныя магістралі. У выніку будаўніцтва знікла і вёска Дзевятоўка на ўскрайку горада, дзе ішлі здымкі фільма «Белыя Росы». Па сутнасці, яна паўтарыла лёс вёскі папулярнай кінакарціны. Ад «кіношнай» гродзенскай вёскі застаўся толькі калодзеж. Нядаўна тут устанавілі драўляныя постаці галоўных герояў стужкі — Фядоса, Цімафея і яго сабакі Валета. У гонар фільма і былых вёсак адна з вуліц новага мікрараёна носіць назву «Белыя Росы».



Андрэй КУХЦЮК.

Дарэчы, назвы іншых вёсак таксама перайшлі ў вуліцы. Так у горадзе з'явіліся вуліцы Паўднёвая, Солы, Падкрыжацкая, Грандзіцкая, Кульбакі, Новікі і іншыя. Былым вёскам даволся пацясніцца, каб упусціць у сваё асяроддзе горад. Гэты працэс зрушыў з месца развіццё тэрыторый — тут пачалі актыўна фарміраваць участкі пад індывідуальнае будаўніцтва. Напрыклад, у былой вёсцы Вішнявец іх створана каля 80. Праўда, і кошт зашкальвае: за 10 сотак — 18 тысяч долараў у эквіваленце. Таму многія аддаюць перавагу кватэрам, тут актыўна вядзецца забудова жылога мікрараёна. Горад усё больш масава засяляе ўскрайкі.

> І хоць дамы даўно знаходзяцца на балансе гарадской ЖКГ, іх абслугоўванне пакідае жадаць лепшага. Па словах жанчын, нярэдка ў падвалах стаіць вада, двор не асвятляецца.

У гарадскім асяроддзі апынуўся і пасёлак Фабрычны з плошчай амаль 232 га. Гэта самая вялікая вясковая тэрыторыя, якая ўвайшла ў склад горада. У свой час пасёлак быў пабудаваны для работнікаў мясцовай птушкафабрыкі. Адсюль нярэдка паступалі скаргі на стан дарог, цеплазабеспячэнне, транспарт. Шмат праблем усплыло падчас пераходу пасёлка на баланс горада — асабліва па стане інжынерных камунікацый.

Што змянілася ў Фабрычным за «гарадскі» перыяд жыцця?

Можна сказаць, што горад узяў былы пасёлак у шчыльнае кола. З аднаго боку яго «падпірае» прамысловая зона, з другога — новы жылы мікрараён. Побач вырас яшчэ адзін — катэджны. Цяпер гэты працэс актывізаваўся. Па словах аднаго з забудоўшчыкаў, тут узводзіцца каля 20 жылых аб'ектаў. «Раней цяжка было атрымаць участак, — кажа Ігар. — Але потым адмовіліся ад стадыёна і аддалі яго тэрыторыю пад жыллё. Амаль усе ўчасткі добра разышліся. Попыт быў вялікі, хоць і кошт — таксама».

Ігар пералічвае плюсы свайго выбару: дзіцячы садок, Цэнтр культуры, гандлёвае забеспячэнне, добрыя дарогі, камунікацыі. Праўда, узнікла праблема з падключэннем электраэнергіі — жыхары другі месяц чакаюць узгаднення праекта ад энергетыкаў.

А вось жыхарка Раіса Міхайлаўна выказала прэтэнзію да транспартнікаў: маўляў, як толькі зрабілі добрую дарогу, праз пасёлак перастаў хадзіць аўтобус № 12, некалькі прыпынкаў зараслі травой. А пажылым людзям цяпер трэба ісці аж у канец вуліцы.

Знайшлося што сказаць і тром жанчынам-пенсіянеркам з завулка Маладзёжнага. Усе яны жывуць у кватэрах, якія ў свой час атрымалі ад птушкафабрыкі. І хоць дамы даўно знаходзяцца на балансе гарадской ЖКГ, іх абслугоўванне пакідае жадаць лепшага. Па словах жанчын, нярэдка ў падвалах стаіць вада, двор не асвятляецца. Гэтыя праблемы ўзнімаліся перад гарадскімі ўладамі і дэпутатамі падчас сустрэчы ў маі гэтага года. Ёсць надзея на іх вырашэнне.

Сёння Фабрычны цяжка назваць вёскай. Паўгода таму пракладзена дарога, прыведзены ў парадак дамы і сядзібы. Хутчэй, гэта месца нагадвае еўрапейскі прыгарад з зялёнай зонай і спакойным укладам жыцця.

Вядома, стан новых гарадскіх тэрыторый не ўсюды мае такі выгляд. Напрыклад, жыхарка мікрараёна, дзе была вёска Забалаць, паскардзілася на дрэнную цэнтральную дарогу. Дарэчы, такі факт не адзінкавы. Развіццё інфраструктуры не паспявае за асваеннем участкаў. Між тым значная плошча свабодных тэрыторый распрацавана менавіта пад індывідуальнае будаўніцтва. Такіх участкаў на сёння ў гарадскім рэестры каля 250. З іх больш за 200 адведзена для тых, хто стаіць у чарзе, астатнія прададуць з аўкцыёну.

Толькі за мінулы год горад рэалізаваў праз чаргу 200 участкаў. Сёлета ўжо 150. Кожны аўкцыён праходзіць з продажам трох-чатырох участкаў. На думку Андрэя Кухцюка, цяпер галоўная задача — забеспячэнне камунікацыямі і інфраструктурай тых мікрараёнаў, якія вядуць актыўную забудову. Работы ў гэтым кірунку хопіць на найбліжэйшыя 10—15 гадоў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Фабрычны ў гарадскім атачэнні.




**ОАО «Дорстройиндустрия»**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | **Оборудование II технологической линии щебеночного завода, г. Фаниполь** | Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 37 | Начальная цена с НДС, бел. руб.<br>153 646,22 | Задаток с НДС, бел. руб.<br>15 364,62 | Шаг аукциона, %<br>5 |
| 10 единиц оборудования: агрегат мелкого дробления ДРО-702-10 (инв. № 4250), агрегат мелкого дробления ДРО-702-10 (инв. № 4251), агрегат сортировки ДРО – 690 (инв. № 4255), агрегат сортировки ДРО – 669 (инв. № 4261), конвейер специальный СМД-151-80 (инв. № 4267), конвейер специальный СМД-151-60 (инв. № 4272), конвейер специальный СМД-151-60 (инв. № 4273), конвейер специальный СМД-151-60 (инв. № 4275), конвейер специальный СМД-151-50 (инв. № 4285), агрегат грануляции ДРО-630 (инв. № 4259) | | | | | |
| **Лот № 2** | **Агрегат грануляции ДРО-630 (инв. № 4260)** | Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 37 | 73 794,00 | 7379,40 | 5 |

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот №1, 2 по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи в течение 5 (пяти) календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота № 1, 2: в течение 10 банковских дней с момента заключения договора купли-продажи.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 01.10.2018 в 11.00 по адресу: г. Фаниполь, ул. Заводская, д. 1-1, 3-й этаж, актовый зал**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона (Продавцом)); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (Объектами) (по форме, установленной Организатором аукциона (Продавцом)) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках не подлежат разглашению.
Задаток перечисляется на счет BY32BAPB30123268800100000000 в ЦБУ № 510 г. Минск, Региональная дирекция по Минской области ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X, УНП 100211220, ОКПО 03455184. Получатель – ОАО «Дорстройиндустрия». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Дорстройиндустрия» (Лоты № 1, 2), проводимом 1 октября 2018 года.
Задаток, уплаченный участником, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта (Объектов). Задаток, уплаченный участниками, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа участника от участия в аукционе.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.00 до 12.00, с 13.00 до 17.00 по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 1-1, каб. 202. Окончание приема заявлений – 28.09.2018 в 17.00. Заключительная регистрация участников – 01.10.2018 с 08.30 до 11.00 по месту проведения аукциона.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом (Объектами). Контактное лицо для осмотра Объекта: Браим Дмитрий Александрович, тел. 8 (029) 774 07 33.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Организатор (Продавец): ОАО «Дорстройиндустрия», г. Фаниполь, ул. Заводская, 1-1, тел.: (01716) 7-31-06, (029) 774-07-33 • www.dsi.by • e-mail: jurist@dsi.by**